# 2023 год

# ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ

*Звесткі з архіва*

*Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі*

*Кніга, як і чалавек, мае дату нараджэння – год, калі яна ўпершыню была апублікавана. І, канешне, у кніг бываюць юбілеі, а яны, як вядома, з’яўляюцца своеасаблівымі каталізатарамі ўспамінаў і служаць нагодай для таго, каб звярнуць увагу на выдатныя старонкі гісторыі літаратуры і кнігадрукавання і ўвогуле ацаніць «базу даных» культурнай спадчыны, асэнсаваць яе ўнікальнасць.*

*У гэтай рубрыцы прадстаўлена інфармацыя аб мастацкіх творах класікаў беларускай літаратуры, першыя выданні якіх захоўваюцца ў архіве Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі і для якіх 2023 год з’яўляецца юбілейным.*

# 80 гадоў

**Куляшоў, А. Сцяг брыгады: [паэма і вершы] / Аркадзь Куляшоў. – [Мінск] : Савецкая Беларусь, 1943. – 77, [2] с.**




Гэтая кніга – зборнік твораў Аркадзя Куляшова (1914–1978), названы па аднайменнай паэме. Акрамя «Сцяга брыгады», у зборнік увайшлі вершы-балады «Над брацкай магілай», у якім цэнтральнай з’яўляецца сцэна пахавання воінаў, што загінулі далёка ад дому ў барацьбе з фашыстамі ; «Ліст з палону», напісаны ад імя палоннай беларускай дзяўчыны, якую вораг вывез у няволю; «Балада аб чатырох заложніках», у якім адлюстравана трагедыя сям’і легендарнага камбрыга Бацькі Міная; вершы «Станцыя Комунары» і «Бацька». У выданні была змешчана і даваенная паэма «Хлопцы апошняй вайны», у якой асэнсоўваецца месца чалавека ў Сусвеце.
Кніга падпісана да друку 26.07.1943. Яе рэдактарам быў П. Глебка. Тыраж – 10 000 экзэмпляраў.

# «Сцяг брыгады»: 80 гадоў

Паэма «Сцяг брыгады», якой распачынаецца куляшоўскі зборнік 80-гадовай даўніны, першапачаткова друкавалася ў часопісе «Знамя» ў №№ 2–3 за 1943 год у перакладзе на рускую мову Міхаіла Ісакоўскага. Твор знайшоў гарачы водгук у чытачоў, яго чыталі ў акопах, урыўкі вучылі на памяць.

Пісаў жа паэму паэт у цяжкіх франтавых умовах 1942 года. Пазней, у 1974 годзе, у гутарцы з У. Міцкевічам (аўтарам кнігі «Аркадзь Куляшоў у школе») ён казаў, што твор быў напісаны за сорак дзён.

## СОДЕРЖАНИЕ


**АРКАДИЙ КУЛЕШЕВ** — Знамя бригады, поэма . . . . . 1
**Ю. ЛИБЕДИНСКИЙ** — Гвардейцы, повесть . . . . . 17
Стихи: **А. СУРКОВ** — Баллада о возмездии; **ПАВЕЛ АНТОКОЛЬСКИЙ** — Баллада о том, как спасся Жан Лекок; **Л. ВЫШЕСЛАВСКИЙ** — Чайка . . . 109
**В. КОЖЕВНИКОВ** — Тарасюк, рассказ . . . . . 114
**ЗИНАИДА ШИШОВА** — Блокада, поэма . . . . . 120
**В. КАВЕРИН** — Самое необходимое, рассказ . . . . . 131


### С ФРОНТА


**ВАС. ГРОССМАН** — Сталинград, очерки . . . . . 135
**С. ГУДЗЕНКО** — Однополчане, цикл стихов . . . . . 183
**Б. ГАЛИН** — Офицеры, очерки . . . . . 185


### КРИТИКА и БИБЛИОГРАФИЯ


**З. КЕДРИНА** — Счастье . . . . . 224
**Д. ГОРБОВ** — Книга о родине . . . . . 230
**И. ГУТОРОВ** — Рассказы о войне . . . . . 232
**С. БОРЩЕВСКИЙ** — Рассказы А. Шарова . . . . . 236
**Я. ЭЛЬСБЕРГ** — Воспоминания ученого . . . . . 238

# «Сцяг брыгады»: 80 гадоў

Некаторыя падрабязнасці гісторыі стварэння «Сцяга брыгады» чытачам раскрыла Валянціна Куляшова, дачка паэта. У сваім артыкуле «У водсвеце сцяга» яна ўпершыню апублікавала ліст, напісаны бацькам 21.X.1942 г. і адрасаваны Міхасю Лынькову як сакратару Саюза пісьменнікаў:

*«Дарагі Міхась!*

*Учора скончыў паэму «Сцяг брыгады», якую пісаў да 25 гадавіны Кастрычніка. Паэма аб айчыннай вайне і Беларусь Памер – 2000 радкоў. Пішу т. Гарбунову пісьмо, каб ён напісаў сюды начальніку палітадцзела і рэдактару просьбу ад свайго імя, каб мяне камандыравалі ў Маскву ў распараджэнне адцзела прапаганды на 25–30 дзён. Думаю за гэты час зрабіць разам з перакладчыкам пераклад на рускую мову і прапанаваць паэму альбо «Известиям», альбо якому часопісу.*

*Паэма, як мне здаецца, атрымалася не кепская. Вядома, адшліфаваць яе не шкодзіць. Хацелася б прачытаць усім вам, бо я тут адзін, як воўк, і прачытаць некаму, а хацелася б ведаць думку людзей, якія ў паэмах разбіраюцца».*

# «Сцяг брыгады»: 80 гадоў

Даследчыкі вызначаюць «Сцяг брыгады» як адзін з самых выдатных твораў савецкай паэзіі ваеннага перыяду і адзін са значных твораў у пісьменніцкай скарбонцы Аркадзя Куляшова.

У паэме адлюстраваны падзеі ад першых дзён вайны, калі галоўны герой Алесь Рыбка развітваецца з рэчамі сваёй мінскай кватэры, пакідае палаючы Мінск і ідзе на суровую і цяжкую бітву з акупантамі, да лістапада 1941 года, калі ён і камісар Зарудны выйшлі з акружэння і вынеслі сцяг брыгады. Менавіта са сцягам і яго выратаваннем звязана галоўная сюжэтная лінія твора.

Як адзначае літаратурны крытык Г. Бярозкін, «у паэме Куляшова няма разгорнутага паказу дзейнасці партызан: толькі ў адным з раздзелаў мы сустракаем скупое ўпамінанне аб «хлапцах і дзяўчатах», якія «гавораць употай з Масквою». Але і не ўжываючы шырокага паказу партызанскага руху, Куляшоў здолеў стварыць выключна яркі паэтычны вобраз беларускай зямлі, якая ўсімі сваімі прасторамі, усім сваім багаццем, да апошняга на полі каменя, да самага маленькага ляснога ручайка, не прыняла, не прызнала акупантаў, змагаецца і перамагае».

# «Сцяг брыгады»: 80 гадоў

«На стварэнне паэмы "Сцяг брыгады" натхнілі вайна і тая акалічнасць, што з першых дзён яе я быў сведкам і ўдзельнікам усяго, што адбывалася вакол. Упэўнены, калі б не знаходзіўся ў радах Чырвонай Арміі, не бачыў франтавога жыцця-быцця, то "Сцяг брыгады" не быў бы напісаны. Памыляецца той, хто лічыць, што паэмы піша паэт. Іх піша жыццё. Мастак – толькі чулая скрыпка, якая адгукаецца на падзеі, а смычком па струнах водзіць усё ж такі бачанае, перажытае, выпакутаванае. Для творчасці няма больш важнай і неабходнай крыніцы, чым жыццё».

А. Куляшоў



# «Сцяг брыгады»: 80 гадоў

За паэму «Сцяг брыгады» А. Куляшову ў 1946 годзе прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР першай ступені. Атрыманую прэмію паэт патраціў на пабудову новага дома бацькам у Хоцімску, замест спаленага фашыстамі.

Прачытаць творы Аркадзя Куляшова, у тым ліку і са зборніка «Сцяг брыгады», можна на сайце віртуальнага музея паэта «Сэрца, дзе ўсёй зямлі трывога» (https://library-mogilev.wixsite.com/kuleshov/poem-cycles), створанага аддзелам маркетынгу Магілёўскай абласной бібліятэкі.